ше напоминая огромный современный европейский книжный магазин, в котором помимо книг вам предлагается широчайший выбор канцтоваров, сувениров, игрушек, аудио- и видеокассет. А для большинства постоянных покупателей ярмарка уже давно стала своеобразным клубом по интересам, где человек может не только увидеть всю палитру книгоиздательской продукции, но и встретиться с друзьями, поговорить на общие темы, обсудить художественные новинки или обменяться мнениями по специальной литературе. И, конечно, купить книгу – себе или друзьям. Ведь книга по-прежнему – лучший подарок!

Ярмарка “Мир книг” в седьмой год своего существования оказывает огромное влияние на рынок в целом и не останавливается в своем развитии; все лучшее у нее – впереди!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАБЛЕМНАЕ ПОЛЕ БЕЛАРУСКАЙ КНІГАЗНАЎЧАЙ НАВУКІ І АДУКАЦЫІ

***Доўнар Ларыса Іосіфаўна,*** *кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, галоўны бібліятэкар аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

Навука пра кнігу, якая пачала складвацца ў XIX ст., у розных краінах набывала свой характар і спецыфічны вобраз [1]. Вытокі і асаблівасці развіцця беларускага кнігазнаўства ў сілу гістарычных і палітычных фактараў даследаваны вельмі павярхоўна або зусім не даследаваны. Але нават абапіраючыся на асноўныя відавочныя факты і сведчанні кнігазнаўчых ведаў, можна адзначыць, што навука пра кнігу на Беларусі развівалася ў агульнаеўрапейскім рэчышчы (дарэчы, ускосна пацверджана ўжо польскімі і літоўскімі даследчыкамі). Гэта асабліва тычыцца вытокаў фармавання ўласна кнігазнаўства, якое бярэ свой адлік у пачатку XIX ст. і ў многім звязана з імем Аляксандра Багаткевіча, ураджэн-

ца Пастаўшчыны (Віцебская вобласць), вылучыўшага кнігазнаўства ў асобны навуковы кірунак. Свае погляды і падыходы ён выклаў у лекцыйным курсе Віленскага універсітэта ў 1828–1829 навучальным годзе [2]. Закрыццё Віленскага універсітэта неспрыяльна адбілася на далейшым развіцці беларускага кнігазнаўства і яго існаванне працягвалася на ўзроўні апісання беларускіх старадрукаў, стварэння каталогаў прыватных і грамадскіх бібліятэк, кнігарняў. Аднак у 1880–90-я гг. з'яўляюцца працы А. Ельскага, П. Уладзімірава, Я. Карскага, прысвечаныя гісторыі беларускай кнігі. Важным быў вынік працы гэтых вучоных па выяўленні, сістэматызацыі і распрацоўцы прынцыпаў ідэнтыфікацыі помнікаў беларускага пісьменства і друку.

На пачатку XX ст. галіну беларускага кнігазнаўства распрацоўвалі краязнаўцы, гісторыкі, філолагі, мастацтвазнаўцы, бібліёграфы. Гісторыя беларускай рукапіснай і друкаванай кнігі, бібліятэчных і архіўных збораў, мастацтва старадрукаў даследавалася Р. Зямкевічам, В. Ластоўскім, У. Пічэтам, А. Шлюбскім, М. Шчакаціхіным і іншымі. У 1920-я гг. былі створаны такія дзяржаўныя ўстановы, як Белдзяржбібліятэка (1922), Інбелкульт (1922–1929), грамадская арганізацыя – Усебеларускае таварыства бібліяфілаў (1927–1929), якія заняліся і асвятленнем кнігазнаўчых пытанняў. Сапраўды, другая палова 1920-х гадоў была даволі пазітыўнай і мела значныя кнігазнаўчыя вынікі [3]. На жаль, беларуская кнігазнаўчая навука аж да сучаснасці не мае асобнай спецыяльна арганізаванай дзяржаўнай установы ў сваёй галіне, як здолелі гэта зрабіць шэраг нашых суседзяў у Літве, Польшчы, Расіі. Беларускае кнігазнаўства трымаецца ў асноўным на пэўных навуковых распрацоўках асобных даследчыкаў.

Першыя беларускія універсальныя энцыклапедычныя выданні, у якія былі ўключаны кароткія артыкулы С. Х. Александровіча [4] і А. І. Раковіча [5] пра кнігазнаўства, практычна толькі занатавалі існаванне беларускай савецкай навукі пра кнігу. Праўда, наступныя аўтары Л. І. Збралевіч [6], а за ёй і В. М. Герасімаў [7] паспрабавалі, выкарыстаўшы гістарыяграфічны падыход, паглядзець на пытанне станаўлення і развіцця беларускага кнігазнаўства глыбей і шырэй, звязаўшы яго з пэўнымі этапамі развіцця пісьменства і друку, даследаваннямі гісторыі беларускай кнігі, увёўшы ў беларускае кнігазнаўства новыя імёны.

Неабходна адзначыць, што навука пра кнігу ў Беларусі на ўсіх этапах яе развіцця ўключалася ў агульную праблематыку гуманітарных навук – філалогіі, гісторыі, філасофіі, мастацтва, культуралогіі. Пэўныя дасягененні ў даследаванні пытанняў гісторыі беларускай кнігі ў межах вызначаных навуковых дысцыплін у канцы 1960 – пачатку 1970-х гг. садзейнічалі і стымулявалі выхад першых кнігазнаўчых выданняў – гэта навуковыя зборнікі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі (ЦНБ НАНБ), якія на пачатку мелі назву "Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии". Складальнікі абгрунтавалі выхад дадзеных зборнікаў вострай патрэбай у капітальнай распрацоўцы гісторыі кнігі, біблія-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэчнай справы і бібліяграфіі ў Беларусі, кола невывучаных пытанняў якіх было настолькі вялікім, што нават любыя спробы навуковага аналізу і абагульнення па гэтых праблемах заслугоўвалі ўвагі [8]. Такім чынам, Акадэмія навук Беларусі (Інстытут літаратуры, Інстытут гісторыі) і яе бібліятэка, асабліва аддзел рэдкіх кніг, сталі прадаўжальнікамі традыцый, закладзеных яшчэ інбелкультаўцамі. Сярод падзвіжнікаў беларускага кнігазнаўства А.І. Мальдзіс, А.П. Грыцкевіч, Г.Я. Галенчанка, М.Б. Батвіннік, В.А. Чамярыцкі, В.І. Дарашкевіч, У.І. Мархель, Л.І. Збралевіч, С.Х. Александровіч, В.Ф. Шматаў і іншыя. З акадэмічнай бібліятэкі перайшла на педагагічную працу і адзін з першых выкладчыкаў курса гісторыі беларускай кнігі ў Мінскім інстытутце культуры Я.С. Умецкая [9], у працах якой змяшчаецца скрупулёзны аналіз крыніцазнаўчай базы па тэме гісторыі кнігі Беларусі XIX ст., а таксама агульная характарыстыка кнігавыдавецкага рэпертуару па тэматыцы, віду і характары выданняў. Цяперашні дырэктар бібліятэкі ЦНБ НАНБ Н. Ю. Бярозкіна – складальнік першага дапаможніка па гісторыі кнігадрукавання Беларусі XVI – пачатку XX ст. [10], у сваіх публікацыях, зазначаючы нераспрацаванасць гісторыі кнігадрукавання на польскай і лацінскай мовах, грунтуецца на выніках даследаванняў па гісторыі рускамоўнага і беларускамоўнага кнігадрукавання ў Беларусі. Сёння ў бібліятэцы плённа працуе і аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў, які мае ў сваёй структуры сектар кнігазнаўства і займаецца кнігазнаўчымі даследаваннямі. З прыходам ў аддзел рукапісаў, старадрукаў і рэдкіх кніг Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) Т.І. Рошчынай актывізаваліся навуковыя даследаванні ў галіне кнігазнаўства і ў галоўнай бібліятэцы нашай краіны. Хаця, зразумела, НББ мела ўжо пэўныя бібліятэчна-бібліяграфічныя распрацоўкі (напрыклад, Ю. Бібілы, І. Сіманоўскага, Н. Ватацы, Р. Чыгіровай), асобныя выданні па бібліятэчнай справе, якія тычыліся і гісторыі беларускай кнігі. Значным вынікам працы НББ стаў зводны каталог “Кніга Беларусі, 1517–1917” (Мн., 1986), які і да цяперашняга часу застаецца адной з галоўных як бібліяграфічных, так і аналітычных крыніц па гісторыі кнігі Беларусі (маюцца на ўвазе ўключаныя ў выданне артыкулы Г. Галенчанкі, Н. Ватацы, Я. Умецкай). Заснаванне і выданне навуковага зборніка “Здабыткі: Дакументальныя помнікі Беларусі” (з 1995 г.), правядзенне Міжнародных Кнігазнаўчых Чытанняў (з 1998 г.), безумоўна, – наступны значны крок наперад НББ у развіцці беларускага кнігазнаўства. Бібліятэка працуе на ўзроўні арганізацыі дзяржаўных нацыянальных праграм такіх, як “Памяць Беларусі”, “Мэтавая праграма па захаванню, кансервацыі і рэстаўрацыі дакументальных помнікаў”, “Radziwiliana”, якія ў сваю чаргу выходзяць на міжнародны ўзровень. Шэраг праектаў НББ падтрымліваюцца ЮНЕСКА. Нарэшце ў 2005 г. у бібліятэцы на базе аддзела рукапісаў, старадрукаў і рэдкіх кніг створаны навукова-даследчы аддзел кнігазнаўства.

Беларускае кнігазнаўства мае магутную падтрымку і замежных даследчыкаў, якія плённа распрацоўваюць і запаўняюць прагалы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў галіне гісторыі кнігі і кніжнай культуры Беларусі – гэта працы Я.Л. Неміроўскага, М.В. Нікалаева, Ю.А. Лабынцава, А. С. Зёрнавай з Расіі; М. Тапольскай, А. Кавецкай-Грычовай, Т. Ільяшэвіча, М. Цыбульскай-Леанарчык, З. Ярашэвіч-Пераслаўцаў, М. Підлыпчак-Маяровіч з Польшчы; Л. Уладзімірава, А.А. Анушкіна, К. Чэпіне, Н. Марозавай з Літвы; Я.Д. Ісаевіча, Ю.П. Ясіноўскага з Украіны; В. Тумаша, З. і В. Кіпеляў з ЗША і інш.

На пачатку 1990-х гг. атрымаў развіццё такі адметны працэс як адкрыццё аддзелаў рэдкіх кніг у бібліятэках ВНУ. І не дзіўна, што адным з першых стаў аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў (АРК), створаны ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў (БДУКМ), на старэйшым факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) якога вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў у галіне бібліятэчнай і кніжнай справы. Грунтуючыся на вопыце і лепшых традыцыях сваіх калег, АРК БДУКМ прадаўжае навуковую і адукацыйна-асветніцкую дзейнасць у галіне беларускага кнігазнаўства, кніжнай культуры Беларусі, пацвярджэннем таму з'яўляецца дадзеная канферэнцыя, якая стала пэўным вынікам 10-гадовай практычнай і навукова-даследчай працы супрацоўнікаў аддзела.

У сярэдзіне 1990-х гг. даследаваннямі сучаснага стану кнігавыдання Беларусі спрабавалі займацца і асобныя кнігавыдаўцы. Адзін з першых, хто зрабіў падобны аналіз, параўнаўшы вынікі кнігавыдавецкай дзейнасці пачатку 1990-х гг. у Беларусі, Расіі і Украіны быў А.С. Патупа [11], стваральнік прыватнага выдавецтва "Эрыдан", якое пачало сваю выдавецкую дзейнасць яшчэ ў канцы 1980-х гг.

Можна адзначыць, што з сярэдзіны 1990-х гг. пачынаецца адлік новага часу для беларускай навукі пра кнігу. Так, за апошняе дзесяцігоддзе з'явілася больш за 600 артыкулаў і асобных выданняў, якія адлюстроўваюць асноўныя кірункі развіцця сучаснага беларускага кнігазнаўства. Адна трэцяя частка гэтых матэрыялаў прысвечана гісторыі кнігі Беларусі ад XI да XXI стагоддзя. Сярод тэматыкі разглядаемых праблем – кніжная культура ВКЛ і Падляшша, старажытныя беларускія рукапісы, гісторыя кнігадрукавання, кнігавыдавецкія сувязі. На другім месцы даследаванні кніжных збораў і калекцый, якія захоўваюцца ў такіх дзяржаўных установах як НББ, ЦНБ НАН Беларусі, Прэзідэнцкая бібліятэка РБ, Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, Полацкі музей беларускага кнігадрукавання, Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей і інш.; а таксама публікацыі па рэканструкцыі збораў і ўліку кніжных помнікаў. На трэцім месцы – публікацыі па друку і СМІ, якія носяць найбольш навукова-папулярны і папулярны характар і асвятляюць сталічную і рэгіянальную прэсу Беларусі.

Што тычыцца такога кірунку, як крыніцазнаўства, то асноўны ўнёсак у яго распрацоўку робяць супрацоўнікі НББ (Т.І. Рошчына, Г.У. Кірэеева), якія ў сваіх публікацыях звяртаюцца да прабле-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мы стварэння поўнага бібліяграфічнага рэпертуару беларускіх выданняў, бібліяграфічнага ўліку кніжных помнікаў, захавання нацыянальнай кніжнай спадчыны. Бясспрэчным аўтарытэтам у галіне мастацтва кнігі з'яўляецца В. Ф. Шматаў. Тэма музея кнігі ў асноўным разглядаецца ў публікацыях Т. А. Сапега. Праблемы выдавецка-паліграфічнага комплекса Беларусі – прыярытэт даследаванняў С. А. Нічыпаровіча. Некаторыя пытанні тыпалогіі кнігі асвятляюцца Т. А. Самайлюк. Нягледзячы на тое, што такія кірункі сучаснага беларускага кнігазнаўства як методыка, метадалогія і тэорыя кнігазнаўства, асобныя віды выданняў, электронная кніга, чытанне кнігі, цэнзура, бібліяфільства, кніжны гандаль, кніжныя кірмашы і выставы застаюцца найменш асветленымі, тым не менш яны таксама пачынаюць прыцягваць увагу даследчыкаў.

Пэўныя праблемы, якія існуюць у адукацыйным працэсе ў галіне кнігазнаўства слаба забяспечанага адпаведнымі кадрамі, звязаны, на нашу думку, з аднаго боку з адсутнасцю кафедры кнігазнаўства на ФІДК БДУКМ і, з другога боку, з адпаведнай скіраванасцю навукова-даследчай дзейнасці на бібліяграфазнаўчую і бібліятэказнаўчую праблематыку. Хоць пэўныя зрухі ўжо ёсць. Так, з 1996 г. працуе Савет па абароне дысертацый БДУКМ па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства"; кнігазнаўства вылучана ў асобны галіновы навуковы кірунак у "Весніку БДУКМ" (выдаецца з кастрычніка 2002 г.); АРК ініцыявана навукова-даследчая тэма "Кніжная культура Беларусі: гісторыка-тэарэтычны аспект", у межах якой плануецца распрацоўка і стварэнне поўнатэкставых баз даных і бібліяграфічнага паказальніка крыніцазнаўчага характару, вучэбнага дапаможніка і манаграфічных прац па гісторыі кнігі Беларусі. Мэтазгодным было б у дадзеным выпадку замацаваць за АРК БДУКМ статус навукова-даследчага кнігазнаўчага цэнтра (лабараторыі), дзейнасць якога садзейнічала б далейшаму развіццю дадзенага кірунку ва універсітэце, спрыяла б падрыхтоўцы маладых кадраў.

Развіццё і паглыбленне навуковых ведаў вырашае з аднаго боку пэўныя праблемы, аднак не застрахоўвае ад іншых. Падсумоўваючы, адзначу, што наступных распрацовак патрабуе метадалогія і агульная тэорыя кнігазнаўства, тыпалогія кнігі і кніжных выданняў; глыбокага аналітычнага даследавання – гісторыя беларускага кнігазнаўства. У ліку першачарговых задач эмпірычнага кнігазнаўства – фундаментальная распрацоўка гістарыяграфіі і крыніцазнаўства; стварэнне фундаментальнай гісторыі кнігі Беларусі. Існуе неабходнасць у даследаванях сучаснага стану кнігі ў Беларусі. Гісторыя кнігі, як сусветная, так і нацыянальная патрабуюць перагляду і новай перыядызацы. Неабходна і пэўная каардынацыя і ўзаемадзеянне ў вырашэнні пастаўленых задач.

На сёняшнім этапе галоўная задача кнігазнаўчай навукі ў Беларусі – сканцэнтраваць інтэлектуальны патэнцыял на яго ключавых кропках і паспрабаваць карпаратыўна вырашыць пастаўленыя задачы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Migoń K. Nauka o księżce. Zarys problematyki / K. Migoń . – Wrocław ; Warszwa ; Kraków ; Gdańsk ; Łódz : Ossolineum, 1984. – 319 s.; Леликова Н. К. Становление и развитие книговедческой и библиографической наук в России в XIX – первой трети XX века / Н. К. Леликова. – СПб., 2004. – С. 394.

2. Теоретик науки о книге Александр Богаткевич и его Труд о всеобщей библиографии // Bohatkiewiczius A.W. Viekalas apie visuotinę bibliografiją / parengė A. Braziūnienė, A. Navickienė, S. Rankelienė. – Vilniaus, 2004. – С. 252–257; Саітава В. І. Вытокі айчыннай бібліяграфічнай адукацыі і бібліяграфазнаўства / В. І. Саітава // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. – 2005. – № 4. – С. 97–105.

3. Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Спроба паясьніцельнай кнігопісі ад канца X да пачатку XIX стагодзьдзя / апрацаваў В. Ластоўскі. – Коўна, 1926; Чатырохсотлецьце беларускага друку, 1525–1925 / адказ. рэд. А. Смоліч. – Менск, 1926.

4. Александровіч С. Х. Кнігазнаўства / С. Х. Александровіч // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя : у 12 т. – Мн., 1972. – Т. 6. – С. 39.

5. Раковіч А. І. Кнігазнаўства / А. І. Раковіч // Беларуская ССР : кароткая энцыкл. – Мн., 1980. – Т. 3. – С. 273.

6. Збралевіч Л. І. Кнігазнаўства / Л. І. Збралевіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мн., 1986. – Т. 3. – С. 83–84.

7. Герасімаў В. М. Кнігазнаўства / В. М. Герасімаў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мн., 1997. – Т. 4. – С. 213–214; Таксама: Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мн., 1999. – Т. 8. – С. 361–362.

8. Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белорусиии / АН БССР, ФБАН ; редкол. Г. Я. Голенченко, Л. И. Збралевич, В. И. Мархель, М. И. Покало, М. П. Стрижонок. – Мн., 1972. – Вып. 2. – С. 3–4.

9. Умецкая Е. С. История книгопечатания в Белоруссии в первой четверти XIX века (1801–1832) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Е. С. Умецкая. – Мн. : АН БССР, 1977. – 27 с.

10. Бярозкіна Н. Ю. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.) / Н. Ю. Бярозкіна. – Мн. : Бел. навука, 1998. – 199 с. : іл.

11. Потупа А. Книгоиздание в Беларуси: мрачные тенденции и светлые перспективы / А. Потупа // Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 3–4 кастр. 1996 г.) / БУК. – Мн., 1997. – С. 5–7.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЦЭНТР БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І КУЛЬТУРЫ МІНСКАГА ЛІНГВІСТЫЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА: ДЫЯЛОГ НАРОДАЎ, ДЫЯЛОГ КУЛЬТУР

***Сюзюмава Тамара Сяргееўна,*** *загадчык сектара аддзела абслугоўвання бібліятэкі Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта*

## Прэзентацыя